Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Я. Макаёнка

ЦБС г. Гродно



# Станіслаў Манюшка і яго музычная спадчына

Бібліяграфічны спісак да 200-годдзя
з дня нараджэння Станіслава Манюшкі

ГРОДНА 2019

*Станіслаў Манюшка і яго музычная спадчына [Тэкст] : бібліяграфічны спісак да 200-годдзя з дня нараджэння Станіслава Манюшкі / ДУК «ЦБС г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Я. Макаёнка ; уклад. Д. У. Крачко. – Гродна, 2019. – 12 с.*

*Спісак прысвечаны выдатнаму польскаму і беларускаму кампазітару, стваральніку опер, балетаў, вакальных твораў, родапачынальніку нацыянальнага опернага мастацтва Станіславу Манюшку. Яму належыць аўтарства першага беларускага («Ідылія») і першага польскага («Галька») оперных шэдэўраў. У 2019 годзе прыхільнікі творчасці музычнага класіка адзначаюць яго 200-гадовы юбілей.*

*Матэрыялы бібліяграфічнага спіска «Станіслаў Манюшка і яго музычная спадчына», якія змяшчаюць артыкулы з энцыклапедычных выданняў, размешчаны ў лагічным парадку, астатнія – у алфавіце аўтараў і загалоўкаў. Бібліяграфічнае апісанне падпарадкоўваецца ДГСТу 7.1-2003 «Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення».*

*Бібліяграфічны паказальнік будзе карысны ўсім тым, хто цікавіцца айчынным музычным мастацтвам.*



Славуты кампазітар, дырыжор, педагог, стваральнік польскай нацыянальнай оперы Станіслаў Манюшка нарадзіўся ў маёнтку Убель Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер Чэрвеньскі раён Мінскай вобласці Беларусі) ў сям'і Часлава Манюшкі і Альжбеты Маджарскай. 5 (17) мая 1819 года ён быў ахрышчаны ў Смілавіцкім рымска-каталіцкім касцёле.

Пачатковую адукацыю атрымаў дома. Першыя ўрокі музыкі яму давала маці, якая добра іграла на фартэпіяна. У 1827 годзе сям'я будучага кампазітара перасялілася ў Варшаву, дзе Станіслаў пачаў сур'ёзна займацца музыкай. У 1830 годзе Манюшкі пераехалі ў Мінск, дзе Станіслаў паступіў у Мінскую мужчынскую гімназію і адначасова ў музычную школу Дамініка Стэфановіча.

У 1837 годзе Станіслаў Манюшка паехаў у Берлін, дзе да 1840 года навучаўся кампазіцыі і ўдасканальваў дырыжорскае мастацтва ў Карла Фрыдрыха Рунгенхагена.

У 1840 годзе Станіслаў Манюшка перабраўся ў Вільню, дзе ажаніўся з Аляксандрай Мюллер. У Вільні ён служыў арганістам пры касцёле Св. Яна, даваў урокі фартэп'яна і кампазіцыі, быў дырыжорам гарадскога тэатра.

У 1840–1850-я гады Манюшка пастаянна бываў у Мінску, дзе жылі яго бацькі, актыўна ўдзельнічаў у культурным і музычным жыцці горада. Менавіта з Мінскам была звязана стварэнне першых яго вадэвіляў, музычных

камедый і камічных опер. У 1841 годзе ў Мінску была пастаўлена камічная опера на лібрэта Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Рэкруцкі яўрэйскі набор», музыку да якой напісаў Манюшка ў суаўтарстве з мінскім музыкантам Канстанцінам Крыжаноўскім. У 1852 годзе ў Мінску адбылася прэм’ера першай беларускай нацыянальнай оперы «Ідылія» («Сялянка»), лібрэта да якой таксама напісаў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, а музыка таксама была створана Манюшкам у суаўтарстве з Канстанцінам Крыжаноўскім.

У 1858 годзе Станіслаў Манюшка перасяліўся ў Варшаву, дзе да 1872 года працаваў дырэктарам і галоўным дырыжорам Варшаўскага Вялікага опернага тэатра, а таксама прафесарам Варшаўскага музычнага інстытута. Манюшка лічыцца стваральнікам польскай нацыянальнай класічнай оперы, класікам польскай і беларускай вакальнай лірыкі, ён меў дачыненне да станаўлення беларускай музычнай культуры.

Станіслаў Манюшка — адзін з самых знакамітых оперных кампазітараў XIX стагоддзя. Яшчэ пры жыцці яго называлі славянскім Шубертам. У яго музычнай скарбонцы – 309 твораў. Станіслаў Манюшка ўвайшоў у гісторыю як родапачынальнік дзвюх нацыянальных опер. Сусветную вядомасць прынеслі яму оперы «Галька», «Страшны двор», «Парыя» і інш.

4 чэрвеня 1872 года Станіслаў Манюшка ва ўзросце 53 гадоў раптоўна памёр у Варшаве ад сардэчнага прыступа.

**Манюшка (Moniuszko) Станіслаў (05.05.1819–04.06.1872)** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2000. – Т. 10. – С. 99–100.

**Монюшко (Moniuszko) Станислав (05.05.1819–04.06.1872)** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск : Беларуская энцыклапедыя, 2007. – Т. 5. – С. 217.

**Монюшко (Moniuszko) Станислав (05.05.1819–04.06.1872)** // Большая советская энциклопедия : в 30 т. / гл. ред. А.М. Прохоров. – Москва : Издательство Советская энциклопедия, 1972. – Т. 16. – С. 553–554.

**Манюшка (Moniuszko) Станіслаў (05.05.1819 – 04.06.1872)** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 5. – С. 72.

**Манюшка (Moniuszko) Станіслаў (05.05.1819–04.06.1872)** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2014. – Т. 5. – С. 378–380.

**Манюшка (Moniuszko) Станіслаў (05.05.1819 – 04.06.1872)** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал. : І. П. Шамякін і інш. – Мінск : БелЭн,1986. – Т. 3. – С. 437–438.

**Монюшко (Moniuszko) Станислав (05 V 1819–04 VI 1872)** // Музыкальная энциклопедия : в 6 т. / гл. ред. А.М. Прохоров. – Москва : Издательство Советская энциклопедия, 1976. – Т. 3. – С. 553–554.

**Манюшка (Moniuszko) Станіслаў (05.05.1819–04.06.1872)** // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : [у 2 т.] / пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2003. – Т. 2. – С. 81.

**Манюшка (Moniuszko) Станіслаў (05.05.1819–04.06.1872)** // Беларусь : энцыклапедычны даведнік. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1995. – С. 464.

**Асіноўскі, С.** Тут, у фальварку Убель… / Святаслаў Асіноўскі // Архівы і справаводства. – 2012. – № 1.

**Аскера, В.** Станіслаў Манюшка : 200 гадоў / Вікторыя Аскера [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : http://www.zviazda.by/be/news/20190521/1558423116-stanislau-manyushka-200-gadou. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Белы, А.** Станіслаў Манюшка сарамлівы, імпульсіўны, безгаспадарлівы і Мінск, які ён зненавідзеў / Алесь Белы // Наша гісторыя. – 2019. – № 4. – С. 36–42.

**200 гадоў з дня нараджэння кампазітара Станіслава Манюшкі** [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : https://bel.sputnik.by/heritage/20190505/1041034838/stanislau-manyushka-200-gadou.html. – Дата доступу: 15.10.2019.

**Запрудскі, І.** Славуты кампазітар, вядомы рэдактар, таленавіты паэт : [Станіслаў Манюшка, Адам Кіркор, Уладзіслаў Сыракомля] / Ігар Запрудскі // Маладосць. – 2019. – № 7. – С. 72–79.

**«Захаваў жывую і гарачую веру». 200 гадоў таму нарадзіўся Станіслаў Манюшка** [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : https://catholic.by/3/news/belarus/9792-zakhava-zhyvuyu-i-garachuyu-veru-200-gado-tamu-naradzi-sya-stanisla-manyushka. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Корбут, В.** «Варшаўскі мост» : Станіслаў Манюшка [Электронны ресурс] / Віктар Корбут. – Рэжым доступу : http://archiwum.radyjo.net/4/91/Artykul/358089. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Корбут, В.** Мінск Станіслава Манюшкі / Віктар Корбут // Беларускі гістарычны часопіс. – 2019. – № 4. – С. 66–71.

**Лабецкі, У.** Манюшка вяртаецца ў Гародню : аб праектах аднаўлення пастаноўкі ў Гродзенскім тэатры аперэты Станіслава Манюшкі «Латарэя» / У. Лабецкі // Краязнаўчая газета. – 2008. – № 29. – С. 6.

**Мальдзіс, А.** Станіслаў Манюшка // Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе / Адам Мальдзіс. – Мінск, 1969.

**Мальдис, А.** «Яму Мінская зямелька родненькая матка!» : к 190-летию польского композитора Станислава Монюшки / Адам Мальдис // Беларусь сегодня. – 2008. – 5 мая (№ 80). – С. 10–11.

**Манюшка С. (1819–1872) – 5 мая 190 год з дня нараджэння польскага і беларускага кампазітара, дырыжора, педагога** // Дадатак да Новых кніг. – 2009. – № 2. – С. 9–11.

**Манюшка – чулы сем'янін** [Электронный ресурс] – Рэжым доступу : https://www.sb.by/articles/manyushka-chuly-sem-yan-n.html. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Мартыненка, В.** Досыць маніць пра паляка Манюшку : аб новым CD-альбоме «Новае неба Станіслава Манюшкі» / Вітаўт Мартыненка // Красота и здоровье. – 2009. – № 31, жнівень. – С. 5.

**Мархель, У.** «Нацыянальнае, краёвае, мясцовае...» : [Станіслаў Манюшка] / Уладзімір Мархель, Віктар Скорабагатаў // Мастацтва. – 2009. – № 8. – С. 52–55.

**Марціновіч, А.** Журавы на радзіму ляцяць : [Станіслаў Манюшка] // Зерне да зерня : гісторыя ў асобах. – Мінск, 2008.

**Мінск Станіслава Манюшкі** // Наша гісторыя. - 2019. – № 4. – С. 38–39.

**Музычны геній зямлі ігуменскай, або З днём нараджэння, пан Станіслаў!** [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : https://www.mlyn.by/2017/05 /muzychny-genij-zyamli-igumenskaj-abo-z-dnyom-naradzhennya-pan-stanislau/. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Рудзинский, В.** Монюшко / Витольд Рудзинский ; [авториз. перевод с польского Е. Бессоновой и Р. Кашер ; предисловие О. Левтоновой]. – Москва : Музгиз, 1960. – 284 с.

**Рудзинский, В.** Монюшко и его связи с русской культурой / Витольд Рудзинский // Рудзинский В. Русско-польские музыкальные связи ; пер. с польского В. Рудзинского. – Москва, 1963.

**Скобелев, Э.** Станислав Монюшко – песенный предшественник Игоря Лученка : беседа с писателем Анатолием Аврутиным / Эдуард Скобелев // 7 Дней. – 2006. – 19 кастрычніка (№ 42). – С. 31.

**Смольский, Б.** Белорусский музыкальный театр / Бронислав Смольский ; [редакторы П. Глебка, А. Ладыгина] ; Институт искусствоведения, этнографии и фольклора Министерства культуры БССР. – Минск : Наука и техника, 1963. – С. 52–63.

**Станіслаў Манюшка** [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : https://www.wikiwand.com/be/. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Станіслаў Манюшка. Вачыма нашчадкаў** [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : http://music.grodno.by/news/ 876-stansla-manyushka-vachyma-nashchadka.html. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Станіслаў Манюшка : вяртанне на радзіму** [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : https://bolshoibelarus.by/rus /novosti-novye/3693-monyushko.html. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Станіслаў Манюшка. Біяграфічныя звесткі. Творчасць** [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабодная энцыклапедыя. – Рэжым доступу : https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Станіслаў Манюшка. Падарожжа ў XIX стагоддзе** [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : https://afisha.tut.by/exhibition/stanislau-manyushka-padarozhzha-u-khikh-stagoddze/. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Хадыка, А.** Станіслаў Манюшка — паляк, літвін…/ Аляксей Хадыка [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : https://novychas.by/kultura/stan_sla_manjushka_paljak. – Дата доступу : 15.10.2019.

**Цімошык, Л.** Размаўляць нотамі Радзімы, альбо Чаму сёння сучасны 190-гадовы Станіслаў Манюшка? / Ларыса Цімошык // Звязда. – 2009. – 7 мая (№ 82). – С.1,2.

**Чаропка, В.** Станіслаў Манюшка : музычны класік з Міншчыны / Вітаўт Чаропка. – Мінск : Харвест, 2015. – 63, [1] с. – (100 выдатных дзеячаў беларускай культуры).

**Шасцілоўская, К.** Роля Станіслава Манюшкі ў канцэртным жыцці культурных цэнтраў Беларусі ў 40–50-я гг. 19 ст. / Кацярына Шасцілоўская // Роднае слова. – 2009. – № 5. – С. 102–105.

**Шулякоўскі, У.** Абаронім Смілавіцкі палац : пра Смілавіцкі палац Ваньковічаў-Манюшкаў / Уладзімір Шулякоўскі // Краязнаўчая газета. – 2008. – № 15. – С. 3.

**Шчэрбачэвіч, Н.** Адновім сядзібу. Усталюем помнік : [да 200-годдзя Станіслава Манюшкі] / Ніна Шчэрбачэвіч // Звязда. – 2014. - 28 студзеня (№ 15). – С. 3.

**Янушкевіч, Я.** Аўтографы Станіслава Манюшкі : Беларуская літаратура XIX - XX ст. у святле архіўных пошукаў / Язэп Янушкевіч // За архіўным парогам. – 2002. – С. 105 – 114.

# СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА
# І ЯГО МУЗЫЧНАЯ СПАДЧЫНА

Бібліяграфічны спіс да 200-годдзя
з дня нараджэння Станіслава Манюшкі

Складальнік : Крачко Д.У.
Рэдактар : Ілюшына І.М.

Тыраж 6 экз.